**Рублеўскі, С.** Быў! Ёсць! Будзе // С. Рублеўскі // Народнае слова. – 1994. – 26 ліп. – С. 1.

## БЫЎ! ЁСЦЬ! БУДЗЕ

У мінулую нядзелю адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка слаўнаму сыну беларускага народа, пісьменніку, нашаму земляку Уладзіміру Караткевічу. Хаця гэтая ўрачыстасць прайшла ў рамках фестываля «Славянскі базар», яны для такой падзеі, вядома ж, цесныя. Без перабольшання можна сказаць, адкрыццё помніка песняру зямлі беларускай – падзея маштабу рэспублікі. Тым больш знамянальна, што яна адбылася напярэдадні Дня незалежнасці нашай Бацькаўшчыны.

Уладзімір Караткевіч кожным сваім радком узвышаў дух беларусаў, спрыяў усведамленню намі сваёй нацыянальнай годнасці.

На ўрачыстасці гучалі народныя песні і найбольш – узнёслыя паэтычныя словы самога Караткевіча. Так сталася, што лёс цесна знітаваў творчае жыццё паэта, празаіка, драматурга з Віцебскам. Калектыў тэатра імя Якуба Коласа ўвасобіў на сцэне яго драматургію. І было надзвычай натуральна, што артысты-коласаўцы чыталі на ўрачыстасці вершы Уладзіміра Сямёнавіча, выконвалі песні на яго словы.

Гэтая знамянальная падзея сабрала ў Віцебску многа высокіх гасцей. На адкрыцці помніка прысутнічаў Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі Мячэслаў Грыб, пісьменнікі Генадзь Бураўкін, Васіль Зуёнак, Пятро Макаль, Уладзімір Някляеў. Ушанавалі памяць славутага земляка старшыня абласнога Савета Уладзімір Кулакоў, іншыя кіраўнікі вобласці і горада, віцебскія паэты Давід Сімановіч і Алег Салтук.

Дзякаваць Богу, што ў такі цяжкі час улады знаходзяць грошы на памяць, клапоцяцца аб падмурку будучыні народа.

Велічны бронзава-гранітны помнік стварыў вядомы віцебскі скульптар Іван Казак. Надзвычай удала ўпісаў яго ў гарадское асяроддзе, ва ўтульны куточак Віцебска архітэктар Валерый Рыбакоў.

Апошнюю сваю прыжыццёвую паэтычную кніжку Уладзімір Караткевіч назваў «Быў. Ёсць. Буду». Гэтыя словы цяпер выведзены на бронзе. А галоўнае, іх спраўдзіла жыццё. Узнёслы рамантык, вялікі знаўца гісторыі Бацькаўшчыны, пясняр прыгажосці і мужнасці яе людзей, Уладзімір Караткевіч увайшоў у кожную хату свядомага беларуса, у кожнае сэрца.

Цудоўна, што помнік яму пастаўлены менавіта на Віцебшчыне, якой ён так захапляўся, якую так любіў. Зямля пад белымі крыламі заўсёды будзе калыскай памяці нашага Валодзі.

Фотакарэспандэнт «Народнага слова» зняў помнік, калі ўжо разышліся пасля ўрачыстасці людзі і да яго падыйшоў хлопчык з кацянём на руках. І мне прыгадалася даўняя паездка з Іванам Казаком у Мінск да сястры Уладзіміра Караткевіча Наталлі Сямёнаўны, руплівай ахоўніцы яго рукапісаў, архіваў. Наталля Сямёнаўна тады паказала нам ліст Валодзі-школьніка да сваёй цёткі. Валодзя распавядаў у ім аб прыгожым шустрым кацяняці, якое прыжылося ў іх доме. А ўнізе аркушыка са школьнага сшытка нават зрабіў малюнак. І вось да помніка нібы прыйшло само маленства Уладзіміра Караткевіча. Хто ведае, можа і гэты хлопчык перальe ў натхнёныя словы хараство беларускай зямлі, прыгажосць і мужнасць яе людзей, легенды і казкі мінуўшчыны.

Не ўмрэ наша слова!

Сцвердзіць сябе наш народ!

**Сяргей Рублеўскі**